*Кацярына Ермаковіч (Мінск)*

# ПРОПАВЕДЗЬ МАРАЛЬНАГА САМАЎДАСКАНАЛЕННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ КІРЫЛА ТУРАЎСКАГА І МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Пятнаццаць-сямнаццаць год — гэта той узрост, калі ў юнакоў і дзяўчат адбываецца фарміраванне сістэмы каштоўнасных арыентацый, складваецца ўяўленне аб ідэальным і рэальным. Літаратуры ў сістэме адукацыі надаецца асаблівае значэнне: як пазначана ў вучэбных праграмах, яна з'яўляецца сродкам «эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных нормаў і вартасцей» [1, с. 4]. З мэтай фарміравання ў школьнікаў цэласнага ўяўлення пра беларускую літаратуру ў гістарычным развіцці, асэнсавання ідэйна-мастацкага зместу лепшых набыткаў прыгожага пісьменства ў вучэбную праграму па прадмеце ўключаны найперш творы маральна-этычнай праблематыкі. Яскравым сведчаннем таму з'яўляецца творчасць выдатнага прамоўцы, царкоўнага дзеяча, пісьменніка і прапаведніка Сярэднявечча Кірыла Тураўскага.

Эпоха Сярэднявечча, і XII ст. у прыватнасці, характарызуецца як час культурнага росквіту грамадства з яго адметным культурным і палітычным ладам. Не будзем забывацца на тое, што ў Кіеўскай Русі было не толькі прынята, але і паступова распаўсюджвалася хрысціянства. Таму ўзрастае важкасць Бібліі, адбываецца вывучэнне і перапісванне святых кніг, у гэты ж час актыўна развіваецца рэлігійная, агіяграфічная літаратура. Даследчыкі літаратуры гэтага перыяду акцэнтуюць увагу на тым, што ў тагачасным грамадстве панаваў культ рэлігійнага падзвіжніцтва, захавання рэлігійных канонаў, догмаў. Менавіта гэты час і вывеў на першы план людзей, моцных верай і духам, тых, хто адчуў пакліканне. Кірыл Тураўскі мог бы паспяхова рэалізавацца ў любой прафесіі, але ў той час самым «прэстыжным» было служэнне Богу. Людзі XII ст., як правіла, захапляліся сумленнасцю, праведнасцю, здольнасцю ахвяраваць матэрыяльныя набыткі на карысць іншых. Менавіта гэты час запатрабаваў людзей, моцных духам і верай, гатовых паслужыць сваёй Радзіме. Можна лічыць, што разам з культам падзвіжніцтва (а гэта з'яўляецца неад'емнай рысай эпохі Сярэднявечча) запанаваў культ слова. Чалавек выклікаў прыязнасць, станавіўся ўзорам для многіх, калі мог гаварыць, чытаць, быў адукаваным, валодаў аратарскім майстэрствам. Думаецца, пропаведзі Кірыла Тураўскага ўспрымаліся тагачасным слухачом не столькі як маралізатарскія, колькі выклікалі захапленне мастацтвам слова, давалі адказы на жыццёва важныя пытанні. Аўтар «Прыпавесці пра чалавечую душу і цела», «Слова ў першую нядзелю пасля Пасхі», «Малітвы ў нядзелю на ютрані» і інш. імкнуўся праз эстэтыку слова падняць людзей на новую прыступку духоўнага ўспрыняцця жыцця.

Пра жыццё выдатнага дзеяча XII ст. звестак захавалася не вельмі шмат. Аднак з жыція невядомага аўтара вядома, што бацькі Кірыла былі заможнымі людзьмі. У адной са сваіх малітваў пісьменнік зазначае, што яму зусім не патрэбны матэрыяльныя багацці, не патрэбна слава, што галоўнае для яго — гэта вывучэнне Боскіх кніг, малітва і паслушэнства. Падмурак быў закладзены,

ідаць, яшчэ ў сям'і, бо блізкія людзі паклапаціліся, каб даць свайму сыну найлепшую адукацыю. Начытанасць і веданне асноў хрысціянства спрыялі выпрацоўцы сістэмы каштоўнасцей Кірыла Тураўскага. Аскетызм (а разам з ім пакорлівасць і паслушэнства), кніжнасць, настаўніцтва, стоўпніцтва — вось тыя складнікі, якія спрыялі працэсу маральнага самаўдасканалення асобы. Стоўпніцтва, дарэчы, — адна з самых суровых формаў аскетычнага жыцця: чалавек наўмысна аддзяляе сябе ад грамадства і мацуецца толькі з малітвай, верай, рыхтуе сваю душу для жыцця вечнага.

Творчая спадчына асветніка Сярэднявечча, гэтак жа як і творчасць Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, М. Сматрыцкага, закладае філасофскія асновы разумення творчых індывідуальнасцей мастакоў слова, становіцца маральным падмуркам пры вывучэнні твораў ваеннай тэматыкі ў X класе, своеасаблівым «тлумачальным мастком» паміж урокамі літаратуры ў IX і X класах. У абставінах вайны яе ўдзельнік апынаецца ў такіх умовах, калі незалежна ад даваеннай адукацыі, прафесійных заняткаў, сацыяльнага статуса павінен выбіраць паміж дабром і злом, жыццём і смерцю, любоўю і нянавісцю, паміж прагай мірных каштоўнасцей (мара кахаць і быць каханым, жыць у сям'і, гадаваць дзяцей, працаваць на ўласнай зямлі, жаданне не быць забойцам) і ваеннымі рэаліямі.

Што ёсць дабро ў ваенных абставінах для герояў М. Гарэцкага?

Калі браць пад увагу праграмныя творы, то дабро з боку камандзіраў заключаецца ў тым, каб захаваць жыцці падначаленых, каб салдаты былі накормлены, цёпла апрануты: «*У казармах, казалі яны* (салдаты. — *К. Е.*) *ідзе абмундзіраванне, даюць усё новенькае шэра-зялёнага колеру. Даюць і новыя боты — і нашы тэлефаністы вельмі шкадавалі, што ў мясцечку не хочуць плаціць і пятай долі "мірнай" цаны. Але, кажуць, салдатаў на таргу — поўна!*» [2, с. 195].

Вестку пра вайну сустрэлі па-рознаму. «Вольныя людзі» з павагай (а можа, нават неяк па-мацярынску) адносіліся да салдат: «*Апраненыя бедна жанчыны вынасілі вёдры вады, бегалі па колькі раз, не шкадуючы турбацыі, каб толькі мы ўсе напіліся. Беленькія паненкі, калі такія, што гаманілі па-расійску ці па-яўрэйску, а не па-польску, кідалі нам у вагоны краскі, а як цягнік адыходзіў, махалі хустачкамі і крычалі нешта вясёлае*» [2, с. 189]. «Гарохі» (вайскоўцы, якія засталіся на звыштэрміновую службу) заклапочана бегалі, стараліся схаваць страшныя думкі, «*насіліся, рассаджвалі па забітых усякімі скрынкамі і сёдламі вагонах сваіх жонак і дзяцей*», але рабілі ўсё так, «*як панскія слугі, лёкаі: каб не дужа каму кідалася ў вочы*» [2, с. 189]. Адчуваецца панаванне невядомасці, панікі, нават страху, але ўсё гэта кожны стараецца схаваць і наадварот падбадзёрваць сябе і іншых.

Вайна мяняе чалавека ў першую чаргу ўнутрана, псіхалагічна, «прымушае» перагледзець сістэму каштоўнасцей, падзяляе жыццё на «Да» і «Пасля». Вось і атрымліваецца так, як у Лявона Задумы: «*Я жыў, але ранейшага мяне навекі няма*» [2, с. 209]. І нават не дапамагае тое, што «*камандзір толькі хрысціцца пасля кожнае каманды*», што за адзін толькі бой

можна пабыць і атэістам у роспачы, і стаць вернікам, які верыць у жыццё і толькі просіць: «*Госпадзі, памілуй мя, грэшнага! — і хочацца хрысціцца, як камандзір, але рэшткі розуму сцюдзёна шавеляцца*» [2, с. 209].

Тураўскі асветнік дае кананічнае вызначэнне паняццям «Дабро» і «Зло», ён дакладна размяжоўвае чорнае і белае. У «Слове на сабор 318 святых айцоў» аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што святыя «*сцвярджалі святую веру, адводзілі ад грахоў, уздымалі тых, хто трапіў у ерась, выратоўвалі тых, хто паграз у спакусах. ... выводзілі людзей са стану злаблівасці, мірылі варагуючых, лячылі тых, хто патануў у пажаданасцях, ратавалі безразважлівых. ... давалі ежу згаладалым і адзенне неапранутым*» [3, с. 56]. Да гэтага павінен імкнуцца чалавек.

Што такое зло ў час вайны?

Праз вобразы галоўных герояў М. Гарэцкага можна паспрабаваць даць адказ на пастаўленае пытанне. Акрамя таго, што забіраюцца жыцці многіх людзей, аказваецца важным выйграць бой любой цаной. Трэба мець на ўвазе, што цана гэта вымяраецца колькасцю чалавечых ахвяр. Вось якую невясёлую карціну чытач бачыць на літоўскім хутарку праз два тыдні пасля абʼяўлення вайны: там, дзе раней каласілася жыта, дзе рупна завіхаліся гаспадары, цяпер стаяць «*крыжы на полі, на краях лесу, ля дарогі за канаваю. ... Іншыя крыжы са звязаных кіёчкаў. І ўжо пахіліліся, і ўжо борзда заваляцца. І згубіцца месца апошняга супакаення воіна*» [2, с. 60].

Зло заключаецца не толькі ў смерці. Зло — гэта яшчэ і пакалечаныя душы людзей: Ян Шымкунас, які не знае, як выратаваць сямʼю і гаспадарку, як паводзіць сябе з ворагам; сыны Яна, за якіх перажывае маці і не ведае, ці жывыя яны; Монця, якую згвалцілі немцы і ў якой будзе дзіця ад ворага; хворая Ядвіся, якая толькі і просіць (тым самым выказваючы агульналюдскую думку): «Не рушце!».

М. Гарэцкі ў апавяданні «Літоўскі хутарок» і запісках «На імперыялістычнай вайне» (менавіта гэтыя творы вывучаюцца ў Х класе) дае шматварыянтнае вобразнае тлумачэнне дабра і зла. Мірныя Шымкунасы робяць дабро і салдатам царскай арміі, і прадстаўнікам нямецкага войска (кормяць, пояць, прыязна размаўляюць), бо гэта забяспечвае фізічнае выратаванне. Хаця, па логіцы, яны павінны былі выбраць, хто ёсць свой, а хто ёсць вораг.

М. Гарэцкі паказвае варыянты: кожны герой па-свойму разумее, што ёсць дабро і зло. І аўтар гэта прымае.

На вайне чалавек апынаецца перад цемрай, хаця любіць святло. Для Кірыла Тураўскага дабро ёсць святло, а цемра — зло. Чалавек, які імкнецца да Бога, да духоўнасці, павінен імкнуцца да святла.

Кірыл Тураўскі ўводзіць такое паняцце, як «брудная душа», якая павінна быць чыстай. Але тут жа зазначае, што ўвесь час трымаць душу ў чысціні вельмі цяжка. А калі гутарка ідзе пра ваенныя абставіны, то гэта зрабіць яшчэ цяжэй. У час вайны «брудная душа» бачыцца як бы пры больш яркім асвятленні. Вайна выкрывала такіх як Хітруноў з запісак «На імперыялістычнай

вайне» М. Гарэцкага, якія баяцца, «*што на вайне яго могуць забіць свае ж салдаты за розныя крыўды*» [2, с. 195].

Чалавек змяніўся зусім нязначна, а калі змены і адбыліся паміж людзьмі эпохі Кірыла Тураўскага і М. Гарэцкага, то ў бок дэградацыі: у выхаванні чалавека няма дасягнутых вышынь. «*Не здраджваць праўдзе, не служыць хлусні*» [3, с. 55]. Праз гэты наказ Кірыла Тураўскага адбываецца як бы ўдакладненне паняццяў «Дабро» і «Зло». Герой дакументальна-мастацкіх запісак «На імперыялістычнай вайне» Лявон Задума — гэта не абстрактны чалавек на вайне, ён беларус з сялянскай сям'і, здольны да назірання і аналізу тых абставін, у якіх апынуўся. Прыгадваецца выпадак, калі разам з доўгачаканымі лістамі ад родных і знаёмых прыйшло некалькі нумароў «Нашай нівы». Камандзір «*пакруціў "Нашу ніву" ў руках, з асаблівай цікаўнасцю прыгледзеўся да мяне — і нічога не сказаў.*

*Радасць маю зняважыў старшы пісар Лебедзеў, калі камандзір выйшаў:*

— ***Ахвота ж пісаць*** *на такой* ***свінячай*** (вылучана аўт. — *К. Е.*) *мове. Ведь по-русски так легко научиться*» [2, с. 242].

Галоўны герой не пагаджаецца, але і не ўступае ў сварку з пісарам, хоць і «*задрыжэла ... усё ад гневу*», бо разумее, што можна казаць «*гэтаму чарнасоценцу, калі ён гаворыць так не ад цемнаты, а свядома і наўмысля*» [2, с. 242]. Задума стаіць на баку таго, што трэба служыць праўдзе, гэта значыць, на карысць Беларусі. Адначасна Лявон разумее, што Першая сусветная вайна беларускага пытання не вырашыла, яе вынікі не паўплываюць на паляпшэнне становішча беларуса на пачатку XX ст. Таму служэнне праўдзе з боку героя запісак адбывалася вось у такіх, на першы погляд, зусім нязначных сітуацыях.

«*Духоўнай працай умацоўвай цела*» — запавет, дадзены Кірылам Тураўскім у «Прыпавесці аб чалавечай душы», правамерна кладзецца на герояў запісак і «Літоўскага хутарка». Лявон Задума, чалавек адукаваны, бачыць і добра ўсведамляе, што вайна нішчыць жыцці, якія не будуць адноўлены. Ён здольны да духоўнай працы, што і дае яму сілы жыць у пастаўленых умовах. Нават у гэтых «дзікіх» абставінах вайны, несправядлівай, непатрэбнай, страшнай, Лявона выратоўвае тое, што ён можа думаць, аналізаваць. І менавіта такая здольнасць да духоўнай працы дапамагае чалавеку ў самых складаных жыццёвых абставінах.

У гэтым свеце нічога не знікае. Зусім невыпадкова, што беларуская зямля ўзгадавала Кірыла Тураўскага, Еўфрасінню Полацкую і іх паслядоўнікаў ажно да М. Гарэцкага… Невыпадковасць гэтая ў тым, што духоўнае нельга вынішчыць. Магчыма, сённяшнія старшакласнікі і не здагадваюцца, што ў іх жыве духоўнае зерне дабра і радасці, пасеянае вялікімі людзьмі нашай зямлі.

Думаецца, можна і далей перачытваць мастацкую спадчыну класіка беларускай літаратуры XX ст. М. Гарэцкага ў святле хрысціянскіх ісцін, падораных слынным філосафам, пісьменнікам, прапаведнікам Кірылам Тураўскім. Бясспрэчна, кантэкст падвысіць аналіз характараў герояў М. Гарэцкага, паглыбіць разуменне іх светапоглядных пазіцый. Відаць, у гэтым

і заключаецца вечная дыялектыка пераемнасці духоўных традыцый мастакоў слова нават на такой вялікай часавай адлегласці, як стагоддзі.

Літаратура

1. Вучэбная праграма па прадмеце «Беларуская літаратура» — Мінск, 2012.
2. Гарэцкі, М. Рунь: апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі. — Мінск: Маст. літ., 2009. — 319 с.
3. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / Уклад., прадм., камент. І. Саверчанкі. — Мінск: Кнігазбор, 2007. — 608 с.

*Мария Тихоненко (Минск)*

## СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ ФИЛОСОФСКОЙ ПРОЗЫ МАКСИМА ГОРЕЦКОГО И ФРАНЦА КАФКИ

Философия начинается с осмысления человеческих, духовных, морально-этических проблем. Философские знания универсальные. Философия изучает отношения бытия и сознания, материи и мышления, природы и духа. Отношения человека и окружающего его мира рассматриваются философией через призму человеческого сознания и культуры.

В философской мысли начала XX в. наблюдается антропологический поворот: на первый план выходят проблемы бытия человека и его внутренний мир, смысл его существования, проблема жизни и смерти, осознание уникальности индивидуума и частой несовместимости его интересов с интересами общества. Будучи неспособным обрести гармонию с окружающим миром, человек откалывается от общества, погружается в глубины самосознания.

Обращение к драматичному, полному острых переживаний, абсурдному, своеобразному миру новелл и притч Франца Кафки и философской прозы Максима Горецкого позволяет проследить становление мировоззренческих концепций писателей. Произведения Ф. Кафки и М. Горецкого объединяет общечеловеческая философская проблематика, в их прозе нашли отражение схожие духовные проблемы общества. Мир, отраженный в произведениях Ф. Кафки и М. Горецкого, наполнен острыми внутренними переживаниями, абсурдом и драматизмом бытия, парадоксальностью человеческого существования. Ф. Кафка писал: «*Каждый человек живет за решеткой, которую он носит в себе. Люди боятся свободы и ответственности. Поэтому они предпочитают прятаться за тюремную решетку, которую сами выстроили вокруг себя. Моя тюремная камера — моя крепость*» [2, с. 556].

Мировоззрение Ф. Кафки трагичное, болезненное, нетрадиционное. Его произведения являются частицей его самого, его подсознания. Произведения писателя — это трагический свет эпохи, преломленный в призме авторского подсознания. Своеобразие Кафки-писателя — его способ отражения жизни, его творческий подход. Произведения писателя явились воплощением его внутреннего состояния, его призраков. «*Кафка всегда пребывал внутри, был погружен в свой мир и копил в себе всю его тяжесть*» [4, с. 14]. Исследователь творчества Франца Кафки литературовед Борис Сучков так характеризовал